Источник: "Беларуская думка" - №10, 2024-10-28



# Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950–70-х гадоў

УДК 8.82.09



Святлана КАЛЯДКА,
доктар філалагічных навук, дацэнт

Святлана КАЛЯДКА. Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950–70-х гадоў. Час, які разглядаецца ў артыкуле, лічыцца ключавым у канцэптуалізацыі даследчай парадыгмы, з ім звязана з'яўленне новых імён вучоных, якія раскрылі свой талент у навуцы літаратурнай крытыцы.

Ключавыя словы: беларускае літаратуразнаўства, навуковы метад, ідэалагемы сацрэалізму, эстэтычныя прынцыпы, навуковыя дыскусіі.

Svyatlana KALYADKA. Scientific methods in Belarusian literary studies in the 1950s–1970s. The period studied by the article is considered crucial for the conceptualization of the research paradigm, it is associated with the rise of new names of scholars in science and literary criticism.

Keywords: Belarusian literary studies, scientific method, ideologies of socialist realism, aesthetic principles, scientific discussions.

**У беларускіх навуковых даследаваннях другой паловы ХХ стагоддзя насуперак пануючай ідэалогіі сацрэалізму з'явілася шмат цікавых ідэй, якія рухалі навуковы працэс наперад і застаюцца актуальнымі ў дачыненні да ацэнкі гісторыі беларускай літаратуры сёння. Менавіта ў гэты няпросты перыяд змены літаратуразнаўчых парадыгмаў (другая палова 1950-х гадоў) заявілі аб сабе літаратуразнаўцы А. Адамовіч, І. Навуменка, У. Калеснік, А. Лойка, А. Клышка, В. Каваленка, А. Яскевіч, М. Лазарук, М. Грынчык, Д. Бугаёў, М. Стральцоў, П. Дзюбайла, Г Кісялёў, А. Мальдзіс, В. Жураўлёў і інш.; літаратуразнаўцы і крытыкі Р Бярозкін, У. Юрэвіч, Ю. Пшыркоў, В. Івашын, Р Шкраба, Н. Перкін, М. Барсток і інш.**

**Актыўна публікуюць манаграфічныя працы і выступаюць у друку ў 1950-60-я гады В. Барысенка, М. Ларчанка, С. Майхровіч, Ф. Куляшоў, В. Івашын, М. Алексютовіч, А. Коршунаў, М. Ярош, Я. Казека, М. Цікоцкі, Ю. Пшыркоў, Н. Перкін, М. Лазарук, К. Хромчанка, А. Семяновіч, П. Ахрыменка, Ю. Канэ, М. Луфераў, Н. Ватацы, Р. Бярозкін, А. Адамовіч, Р. Шкраба, У. Юрэвіч, У. Калеснік і інш.**

**У крытыцы паэзіі задаюць тон У. Гніламедаў, В. Бечык, У. Бойка, В. Рагойша, Р Бярозкін, А. Лойка, У. Калеснік, А. Клышка, В. Бур'ян, А. Вярцінскі, С. Гаўрусёў і інш.**

## ПРА АЎТАРА

КАЛЯДКА Святлана Уладзіміраўна.

Нарадзілася ў вёсцы Стайкі Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыла Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С. Пушкіна (1993), аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі (1996).

З 1997 года працуе ў Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі: малодшым, навуковым, старшым, вядучым навуковым супрацоўнікам.

Доктар філалагічных навук (2021), дацэнт (2011).

Аўтар больш за 200 навуковых работ, у тым ліку пяці манаграфій, пяці вучэбна-метадычных дапаможнікаў у суаўтарстве, раздзелаў у сямі калектыўных манаграфіях.

Сфера навуковых інтарэсаў: тэарэтычная паэтыка, літаратуразнаўчая эматыялогія, тэксталогія, беларуская паэзія ХХ–ХХІ стагоддзяў.



Святлана Калядка. Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950-70-х гадоў

Источник: "Беларуская думка" - №10, 2024-10-28



У той жа час адбывалася паглыбленне сацыялагічных і гісторыка-тэарэтычных асноў літаратуразнаўства і крытыкі. Толькі ў другой палове 1950-х з'яўляюцца даследаванні, у якіх вучоныя дэманструюць авалоданне майстэрствам аналізу структуры твора, яго паэтыкі, элементаў формы – кампазіцыі, сюжэта і г. д., хоць, як заўважае М. Мушынскі, «раней зварот да гэтых пытанняў не даваў плённых вынікаў, бо далей абстрактных размоў справа не пайшла: разгляд формы зводзіўся да асобных заўваг адносна моўна-стылявых асаблівасцей твора, мовы героя або недакладна ўжытага пісьменнікам слова» *[1, с. 171]*. Быў, безумоўна, уплыў структуралізму на фарміраванне навуковых метадаў даследавання беларускіх вучоных, і гэты ўплыў уздзейнічаў на з'яўленне новага вектара ў руху наперад: глыбокі літаратуразнаўчы аналіз з далучэннем да яго метадаў філасофіі і псіхалогіі дазволіў разгледзець у герої твораў Асобу (навуковыя працы Л. Гараніна, А. Матрунёнка, А. Яскевіча і інш.). Спалучэнне інструментарыю блізкіх гуманітарных дысцыплін дапамагала даследчыку адкрываць новыя пласты аб'ектыўнай і суб'ектыўнай рэчаіснасці, набліжацца да пазнання глыбінных асноў чалавечай душы.

У гэтым паяднанні мастацка-эстэтычных, філасофскіх, псіхалагічных і тэарэтыка-метадалагічных падыходаў і метадаў відавочна ўздзеянне заходнееўрапейскага філасофска-эстэтычнага кантэксту навукі аб літаратуры на навуковую думку беларускіх даследчыкаў: калі да 1950-х гадоў «большасць вучоных арыентавалася на сацыялагічны метад даследавання, але канкрэтныя вынікі залежалі ад таго, у якой ступені аўтар здолеў спалучыць сацыялагічны падыход да літаратуры з эстэтычным, як ён разумеў эстэтычную прыроду мастацтва» *[2, с. 10]*, то з 1950-х у цэнтры ўвагі даследчыкаў апынуліся пытанні эстэтычнага ўзроўню літаратуры, мастацкага стылю, культуры творчасці ў шырокім разуменні слова. Іх цікавіў філасофскі змест з'яў і падзей, адлюстраваных у творах, духоўнае жыццё чалавека, яго грамадская і творчая дзейнасць, узаемаадносіны паміж людзьмі і ўсім светам. Як трапна заўважыў М. Мушынскі, «па сутнасці гэта быў працэс выпрацоўкі і ўдакладнення агульных метадалагічных прынцыпаў аналізу літаратуры і разам з тым асэнсаванне ідэйна-эстэтычных прынцыпаў, на якіх павінна была развівацца беларуская савецкая літаратура» *[1, с. 201]*.

Менавіта ў гэты час растуць як грыбы пасля дажджу навуковыя даследаванні, у якіх абіраецца сістэма сродкаў і прыёмаў, скіраваных на глыбокае асэнсаванне філасофіі жыцця, спосабы і метады псіхалагізму, з дапамогай якіх імкнуліся зразумець няпросты ўнутраны свет героя. Аднак метадалагічнай базай шматлікіх даследаванняў заставалася вылучэнне сацыяльна-гістарычных і эстэтычных заканамернасцей станаўлення беларускай літаратуры – ці праз сацыяльнае да эстэтычнага: «Кнігу У. Калесніка „Паэзія змагання", прысвечаную даверасьнёўскай творчасці М. Танка і заходнебеларускай літаратуры, можна з поўным правам лічыць выдатным узорам спалучэння сацыялагічнага і эстэтычнага аналізу літаратуры» *[1, с. 251]*. Гэта «першая даследчая праца, у якой творчасць М. Танка разглядаецца не проста на грамадска-літаратурным фоне, а як арганічная частка ўсёй заходнебеларускай літаратуры» *[1, с. 252]*.

З 1960-х гадоў навуковая думка паступова эвалюцыянавала па шляху пераадолення ідэалагічных установак сацрэалізму, абнаўлення метадалогіі і пошуку новых каштоўнасных арыенціраў. У гэты перыяд «крытыкі паспяхова засвойвалі прынцыпы навуковага аналізу, уменне заглыбляцца ў сутнасць з'яў, раскрываць іх сацыяльна-класавыя карані і вытокі. А літаратуразнаўцы ў сваю чаргу вучыліся больш арганічна звязваць мінулае з сучасным» *[2, с. 54]*. Сапраўды, даследчыкі вучыліся рабіць цэласны аналіз асобнага твора, што з'яўляецца адным з палажэнняў структуралізму, але ў яго аснове павінны былі захоўвацца ідэалагічныя ўстаноўкі, якія эфектыўна выконвалі задачу рэпрэзентацыі сацыяльных пераўтварэнняў. Таму перадавыя працэсы ў пошуку новых навуковых платформ для асэнсавання мастацкага твора і творчасці суседнічалі з вымушанай заангажаванасцю даследчых метадаў.

Мы не можам сцвярджаць, што, нягледзячы на актывізацыю навуковай думкі, у 1960-я нарэшце канцэптуалізавалася новая даследчая парадыгма, хутчэй, падыходы да яе доўгі час выпрацоўваліся ў крытычных матэрыялах. На старонках часопіса «Полымя», газеты «Літаратура і мастацтва» ў канцы 1930-х – пачатку 1940-х, а потым у 1950–60-я праходзілі самыя гарачыя дыскусіі па набалелых пытаннях развіцця літаратуры,



Святлана Калядка. Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950-70-х гадоў

Источник: "Беларуская думка" - №10, 2024-10-28



у друку быў змешчаны шэраг змястоўных, востра праблемных артыкулаў. З 1956 па 1959 год на старонках беларускай перыёдыкі адбылася, па сутнасці, адна літаратурная дыскусія – выступленні А. Адамовіча, Т. Хадкевіча, Н. Кісліка. На працягу 1960–1965 гадоў палемічных «разборак» было шмат, ставіліся наступныя праблемы: маладая паэзія, беларускі раман, майстэрства пісьменніка, пісьменнік і час, сучаснік у жыцці і літаратуры, дзіцячая літаратура і г. д. І гэтыя публікацыі ў перыядычным друку зафіксавалі напрамкі пошуку новых даследчых метадаў.

Напрыклад, размова пра беларускую раманістыку ў «Полымі» вельмі арганічна перайшла на старонкі газеты «Літаратура і мастацтва» (ліпень – верасень 1964 года), дзе выступілі І. Навуменка, М. Лобан, А. Вярцінскі, Я. Герцовіч, М. Стральцоў, П. Дзюбайла, С. Андраюк, А. Мальдзіс, Д. Бугаёў, А. Пяткевіч, А. Аляшкевіч, Б. Бур'ян, В. Каваленка, Н. Перкін, В. Івашын. Вынікі дыскусіі на старонках названых перыядычных выданняў былі падведзены на пленуме Саюза пісьменнікаў БССР (25–26 верасня 1964 года). Па сутнасці, гэта быў першы ў пасляваенны час пленум, дзе разглядаліся канкрэтныя праблемы беларускага рамана, узнятыя на старонках перыёдыкі. Разнавектарная крытыка заўсёды віталася ў перыядычным друку: літаратурныя дыскусіі, спрэчкі, палеміка заставаліся скіраванымі на «анатаміраванне» застарэлых праблем, на выяўленне станоўчага і адмоўнага ў суб'ектыўным бачанні чытачом напісанага аўтарам (я лічу, што, не зважаючы на філалагічную ці навукова-акадэмічную падрыхтаванасць крытыка да аналізу прачытанага, яго думка будзе заўсёды суб'ектыўнай). Як пісаў М. Мушынскі, «крытыка не ўхілялася ад размовы пра цяжкасці, страты на творчым шляху. Наадварот, яна лічыла сябе абавязанай адкрыта гаварыць пра адмоўныя з'явы, пра супярэчнасці, пралікі, бо толькі так можна было сапраўды глыбока раскрыць ідэйна-творчую эвалюцыю пісьменніка» *[1, с. 212]*.

Безумоўна, 1960-я гады былі вызначальнымі ў фарміраванні беларускай навуковай ідэнтычнасці. «Калі другая палова 50-х гадоў была перыядам выпрацоўкі агульных зыходных ідэйна-творчых, эстэтычных прынцыпаў літаратуразнаўства і крытыкі, то ў першай палавіне новага дзесяцігоддзя пачынаўся працяглы па часе этап іх творчай рэалізацыі, узбагачэння», – адзначаў М. Мушынскі *[1, с. 290]*. Літаратуразнаўства засяродзілася на эстэтычным прынцыпе апісання літаратурнай з'явы – і гэта пасля ідэалагічнага монацэнтрызму ў даследчай парадыгме дадавала аптымізму. Згадваецца філасофскае мудраслоўе «Эстэтыка – этыка будучыні», якое як мантру паўтараў на пасяджэннях аддзела тэорыі літаратуры Міхась Аляксандравіч Тычына. Аднак эстэтычны падыход да інтэрпрэтацыі літаратуры, безумоўна, вяртаў раздроблены свет навуковых ідэй да нейкага ўмоўна вызначанага абсалюту, але ж і зноў яго звужаў. Таму што, як слушна заўважае М. Тычына, у складаныя перыяды самаідэнтыфікацыйных працэсаў «узнікае праблема абгрунтавання ведаў у літаратуразнаўстве, неабходнасці выпрацоўкі крытэрыяў «выбару тэорыі» ў сітуацыі неадзінкавасці апісання, вывучэнне «метамовы» літаратуры, суадносіны тэрмінаў і паняццяў, пабудова тэзаўрусаў і іншае. Асаблівае месца сярод рэфлексіўных метадаследаванняў літаратуразнаўства займае задача вызначэння яго асноў, зыходных базісных палажэнняў, дапушчэнняў, пастулатаў, прынцыпаў, неўсвядомленых пасылак, якія ляжаць у аснове навуковых пабудоў і ўяўленняў» *[3, с. 190]*.

А што адбывалася насамрэч? На пісьменніцкіх з'ездах адзначалася агульная тэндэнцыя на «пацяпленне» і з'яўленне на старонках перыядычных выданняў твораў пісьменнікаў, якія раней лічыліся ворагамі народа. Агульную атмасферу вызначалі падзеі хрушчоўскай адлігі і вынікі XX з'езда КПСС. Яны ж прадвызначылі і пэўную разгубленасць: з аднаго боку, вярталіся ў літаратурнае жыццё забытыя імёны, з другога – адбывалася персаніфікацыя крызісных з'яў, і пад ідэалагічна ненадзейных пісьменнікаў траплялі найлепшыя прадстаўнікі мастацтва слова. Тэарэтычныя і практычныя замеры літаратурнага працэсу паказвалі, што даследчыкі не паспяваюць асвойваць новыя тэорыі і прымяняць іх у аналізе вялікай колькасці твораў, якія нарадзіла пасляваенная рэчаіснасць.

Пра гэтыя і іншыя праблемы на навуковым полі не толькі беларускага, але і ўсяго савецкага літаратуразнаўства пісаў і М. Мушынскі. «Недастаткова актыўна распрацоўваецца беларускімі вучонымі,



Святлана Калядка. Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950-70-х гадоў

Источник: "Беларуская думка" - №10, 2024-10-28



крытыкамі літаратуразнаўчая тэрміналогія. Востра стаіць і пытанне культуры навуковага даследавання, асабліва сярод маладых вучоных», – наракаў даследчык *[2, с. 93]*. «У другой палове 60-х гадоў пачынаюць адчувацца непажаданыя тэндэнцыі – зніжэнне патрабавальнасці, часам прымірэнчыя адносіны да літаратурнага браку, да рамесніцтва, маральны кампраміс, на які часта ідзе крытык, неадпаведнасць паміж узроўнем яго майстэрства і маральнай пазіцыяй. <…> Кампліментарнасць падмяніла сабой аб'ектыўны, непрадузяты разгляд», – шкадаваў ён, разумеючы, што час для так званага культурнага рэнесансу ў літаратуразнаўстве быў тады найбольш спрыяльным *[2, с. 79]*.

І сапраўды, у навуковым жыцці расійскай акадэмічнай установы збіраліся пайсці на радыкальныя эксперыменты. На гэты конт Я. Трушчанка пісаў: «Выдвигалась задача построения новой филологической науки, граничащей с языкознанием и литературоведением, но не сливающейся ни с тем, ни с другим» *[4, с. 82]*. Менш радыкальна ўспрымалі суіснаванне ў гуманітарным навуковым полі адрозных тэарэтыка-метадалагічных сістэм і канцэпцый, спаборніцтва традыцыйных і інавацыйных метадаў беларускія даследчыкі. «У беларускім літаратуразнаўстве, – адзначаў М. Мушынскі, – ёсць нямала праблем, якія могуць быць паспяхова вырашаны толькі сумеснымі намаганнямі прадстаўнікоў гуманітарных навук – філосафаў, гісторыкаў, мовазнаўцаў, сацыёлагаў, мастацтвазнаўцаў і інш. Неабходна весці даследаванне на грунце ўзаемадзеяння літаратуразнаўства з сумежнымі гуманітарнымі навукамі. Гэта перспектыўны шлях развіцця літаратуразнаўства» *[2, с. 95]*.

Як бачым, ужо ў 1960-я ставілася задача развіцця міждысцыплінарных даследаванняў, аднак рэальна толькі ў пачатку XXI стагоддзя з'явіліся акадэмічныя навуковыя працы «Міждысцыплінарныя даследаванні актуальных праблем тэорыі літаратуры» (2011), «Тэорыя літаратуры ў дыялогу еўрапейскіх культур» (2017), у якіх падкрэслівалася, што толькі на міждысцыплінарнай аснове, у злучэнні навуковых сістэм гуманітарных навук з далучэннем тэхналогій прыродазнаўчых адгалінаванняў навуковых ведаў, можна вырашаць актуальныя літаратуразнаўчыя праблемы. Дый гісторыя Інстытута літаратуразнаўства НАН Беларусі, які, пачынаючы з 1931 года, злучаўся з Інстытутам мовазнаўства, затым этнаграфіі і мастацтва, сведчыць, што гадамі набываўся досвед вывучэння нацыянальнай традыцыі ў полі магутнага канструктыўнага ўздзеяння розных гуманітарных канцэпцый, а таму неабходным стала суіснаванне розных навуковых падыходаў – іх узаемадзеянне па «прынцыпу дадатковасці» (Д. Ліхачоў). Асабліва міждысцыплінарныя даследаванні неабходны ў наш час, бо, як адзначаў некалі Міхась Аляксандравіч, «нацыянальная культура перастала быць літаратурацэнтрычнай, інакш кажучы, эстэтычныя канцэпцыі, якія раней грунтаваліся амаль на адным літаратурным вопыце, у апошні час улічваюць мастацкі вопыт іншых відаў мастацтва. Мастацкай літаратуры, такім чынам, усё цяжэй захоўваць прыярытэт адзінага вербальнага віду мастацтва» *[3, с. 46]*. І сучасны пісьменнік у творы паўстае і псіхолагам, і філосафам, і мастаком, і аранжыроўшчыкам, а гэта патрабуе ад даследчыка засваення новых функцый аўтара, спосабаў выражэння яго суб'ектнасці.

Акрэсліліся тэндэнцыі да асэнсавання творчай індывідуальнасці пісьменніка, яго ўнікальнага таленту, які і робіць яго знакавай фігурай у літаратурным працэсе: «Заслуга крытыкі другой паловы 50-х гадоў заключалася ў тым, што яна <…> тэарэтычна абгрунтавала неабходнасць вывучэння мастацкай індывідуальнасці, бо тыповае, агульнае ў літаратуры, мастацтве існуе толькі ў форме адчувальна-канкрэтнага, індывідуальна-непаўторнага. <…> Між іншым беларускія даследчыкі яшчэ ў 20-я гады звярталіся да гэтай праблемы» *[1, с. 214]*.

У 1960-я, а затым і ў наступныя дзесяцігоддзі ў навуковых даследаваннях асэнсоўваўся тып таленту і характар светаадчування пісьменніка, яго творчы метад, мастацкі стыль, ідэйна-тэматычная і жанравая своеасаблівасць творчасці пісьменніка, разнастайнасць яго вобразнай сістэмы, у тым ліку характар героя, адметнасць псіхалагізму і г. д. У вывучэнні пісьменніцкай самабытнасці, стылю мастака, праблемы творчага майстэрства многае зрабілі ў 1950–70-я А. Яскевіч, Р. Шкраба, У. Калеснік, Д. Бугаеў, Р. Бярозкін, А. Адамовіч. Стылістыка, мова твораў, тэорыя паэтычнай мовы, паэтыка – гэтыя і іншыя аспекты прэваліравалі ў гісторыка-апісальных



Святлана Калядка. Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950-70-х гадоў

Источник: "Беларуская думка" - №10, 2024-10-28



і тэарэтычных даследаваннях 1970–80-х. Стыль не зводзіўся да моўнага почырку. Дамінантай стылю было адзінства поглядаў мастака на жыццё, выяўленае ў характары ідэй, у сістэме яго вобразаў, у сюжэце, кампазіцыі і г. д. «Мастацкі стыль – гэта чалавек, увесь чалавек, з усім багаццем яго думак аб жыцці, яго пачуццяў, з яго складам вобразнага бачання свету, з яго моўнай манерай», – сцвярджаў А. Адамовіч *[5, с. 4]*. І з гэтым нельга не пагадзіцца. Як і з выказваннем Д. Ліхачова, які акцэнтаваў увагу на тым, што ў гісторыі мастацтваў усё больш важным становіцца непаўторнае, індывідуальнае, што не падпарадкоўваецца законам: усе заканамернасці маюць супрацьстаялыя ім «„антизакономерности" – своего рода проявления „свободы воли" историко-литературного процесса» *[6, с. 27]*. Чым далей мы глядзім з пазіцый сённяшняга дня, тым больш імкнёмся знайсці ў творах феномены, парадоксы, нават дэвіяцыі, якія дэманструюць непаслухмянасць аўтара і робяць творы ўнікальнай з'явай. Тым цікавей падобныя творы даследаваць.

Адпаведна змянілася ўяўленне пра станоўчага героя. «На першы план выйшлі яго чалавечыя якасці, інтэлектуальны патэнцыял, маральная, эмацыянальная ўзброенасць, духоўныя запатрабаванні. У творах беларускіх празаікаў узрасло пачуццё гістарызму, больш актыўна пачала асвойвацца тэма горада. Як значнае дасягненне беларускай літаратуры былі ахарактарызаваны раманы І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, П. Пестрака, А. Чарнышэвіча, А. Адамовіча, аповесці В. Быкава, А. Карпюка і інш.», – канстатуе М. Мушынскі *[1, с. 328]*. Увогуле станоўчы герой – гэта своеасаблівая ідэалагема ўнутры твора (бо праз яе рэпрэзентуецца ідэалогія часу), якая арганізуе ўсю яго прастору, структурыруе развіццё дзеяння: менавіта ад характару ідэалізацыі героя залежыць пабудова ўзаемаадносін персанажаў. Больш за тое, станоўчы герой паўстае шматузроўневым ідэалагічна маркіраваным канцэптам, які ўваходзіць ва ўсе ўзроўні тэкставай арганізацыі і падсвечвае кожнае дзеянне, акт у творы святлом «інкрымінаванай» яму станоўчасці. Праз ідэалагему «станоўчы герой» перадавалася карціна свету, навязваліся каардынаты светаўспрымання. На заранку яе зараджэння гэта ідэалагема мела сувязь з таталітарнай мовай савецкай эпохі: герой, па вялікім рахунку, надзяляўся стандартным наборам якасцей і рыс, і аўтарскія вольнасці ў гэтым не прывячаліся. З дапамогай прапаганды праз мастацкі тэкст пэўнага ідэалагічна правільнага вобраза адбывалася маніпуляванне чытацкім успрыманнем і фарміраванне свядомасці «савецкага чалавека». Цягам часу гэты вобраз стаў набываць больш «прызямленыя» характарыстыкі, а разам з гэтым знікла неабходнасць ужываць азначэнне «станоўчы». Такім чынам, ідэалагема «станоўчы герой» у сучасных даследаваннях разглядаецца як канцэптуальны элемент ідэалогіі, які рэпрэзентуецца ў мастацкім тэксце на розных узроўнях.

У сярэдзіне XX стагоддзя ў працах айчынных літаратуразнаўцаў пачалі выпрацоўвацца тэарэтычныя прынцыпы тыпалагічнага вывучэння літаратуры, стымулявалася гісторыка-функцыянальнае даследаванне мастацтва слова, фарміравалася сістэмна-структурная метадалогія. Асэнсоўвалася адрозненне паміж сістэмнымі сувязямі і тыпалагічнымі адпаведнасцямі ў навуковых працах У. Мархеля, Г. Кісялёва, В. Чамярыцкага і іншых з дапамогай гісторыка-генетычнага і параўнальна-гістарычнага прынцыпаў вывучэння літаратурных працэсаў.

Усё больш з'яўлялася патрабаванняў да самога даследчыка, якому, як і пісьменніку, патрэбна мець сталы светапогляд, глыбока ведаць жыццё, няспынна ўзбагачаць свой моўны, вобразна-выяўленчы арсенал, вывучаць творы пісьменнікаў (шмат чытаць), добра арыентавацца ў вуснай народнай творчасці, пераадольваць спакусу задавальняцца «абкатанымі» тэорыямі. Васіль Быкаў выступаў за высокую інтэлектуальнасць мастака, якая выяўляецца ў глыбокай павазе да свету духоўнасці. Хацелася б, каб гэтым надзелены былі і навукоўцы.

Даволі крытычна М. Мушынскі разглядаў навуковыя працы і маладых даследчыкаў, і мэтраў навукі. У яго высновах не аднойчы сустракаем наступныя ацэнкі: «вульгарызатарскія ўстаноўкі», «голая сацыялагічная схема», «хварэць на бытапісальніцтва», «апісальнасць», «ілюстрацыйнасць», «наіўная імітацыя жыцця», «пасіўная канстатацыя з'явы без спробы раскрыць яе вытокі», «супярэчнасць паміж канкрэтным аналізам і вывадамі», «фактаграфія, не аплодненая глыбокай думкай», «звядзенне шматлікіх сюжэтаў да пэўнай колькасці схем»



Святлана Калядка. Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950-70-х гадоў

Источник: "Беларуская думка" - №10, 2024-10-28



і г. д. Адзначаліся невысокі тэарэтыка-метадалагічны ўзровень даследаванняў, засяроджанасць на шаблоне «тэма – ідэя – праблема – вобразная сістэма», што абмяжоўвала ракурсы інтэрпрэтацыі, не пераадоленая да канца боязь разгляду мастацкай формы. Даследчыку не трэба пераказваць змест твора, каменціраваць тое, што ляжыць на паверхні, яму варта «раскрыць яго ўнутраны сэнс, ідэйную накіраванасць, выяўленую не ў адкрытых аўтарскіх выказваннях, а праз узаемаадносіны герояў, праз іх сутыкненні і г. д.» *[1, с. 168]*. Як адзначаў М. Мушынскі, гістарызм у падыходзе да ўзнятай праблемы і спробы вызначыць унутраныя заканамернасці станаўлення пэўнай з'явы ёсць перспектыўная метадалагічная платформа для правядзення даследавання. Гэтага і сёння дастаткова (калі можна лічыць названы тэарэтыка-метадалагічны прынцып, што стаў традыцыйным, дастатковым) для напісання дыпломнай, кандыдацкай дысертацыйнай працы як кваліфікацыйных, дзе даследчык дэманструе ўменне карыстацца навукова-тэарэтычнымі метадамі, спосабамі, прыёмамі і практыкай аналізу.

Аднак пры гэтым нельга глыбокі, грунтоўны аналіз замяняць дэкларацыйнай, да таго ж празмерна агульнай ацэнкай, на што хварэлі вельмі многія даследчыкі і раней, і сёння. Ацэнка літаратуразнаўцы не павінна руйнаваць гарады, але і не можа пераўтварацца ў банальны водгук на прачытаны тэкст. Даследчык, які стаў асобай у навуцы, заўсёды арыентуецца на стварэнне асобных методык і інтэрпрэтацыйных мадэлей. Пры гэтым ён вымушаны ўлічваць камунікатыўныя канцэпцыі, паколькі менавіта яны зыходзяць з наяўнасці ў творчым акце не толькі аўтара і паведамлення, але і «спажыўца» мастацтва слова.

У 1970-я гады «адбываецца трансфармацыя жанравай структуры навуковага даследавання: розныя жанравыя пачаткі ў сваім спалучэнні ствараюць новую, вельмі змястоўную форму» *[2, с. 78]*, і магчымасці новай формы, безумоўна, узмацняюць даследчую оптыку, паглыбляюць метадалагічныя рэфлексіі, пашыраюць рэсурсы тэарэтычнай думкі.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 17.05.2024 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка літаратуразнаўства: 40-я – першая палавіна 60-х гадоў / М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 344 с.
2. Мушынскі, М.І. Беларускае савецкае літаратуразнаўства / М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 96 с.
3. Тычына, М.А. Філасофія літаратуры: беларускі варыянт / М.А. Тычына. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 322 с.
4. Трущенко, Е.Ф. Академическая наука о литературе в 60-80-е годы: заметки ученого секретаря ОЛЯ АН СССР / Е.Ф. Трущенко, А.А. Ревякина // Наука о литературе в XX веке: (История , методология, лит. процесс): сб. ст. / Рос. акад. наук, Ин-т науч. информ. по обществ. наукам; редкол.: А.А. Ревякина (отв. ред. и сост.) [и др.]. – М.: ИНИОН РАН, 2001. – С. 77–96.
5. Адамовіч, А.М. Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю К. Чорнага / А.М. Адамовіч. – Мінск: АН БССР, 1958. – 180 с.
6. Лихачев, Д.С. Закономерности и антизакономерности в литературе / Д.С. Лихачев // Русская литература. – 1986. – № 3. – С. 26–29.



Святлана Калядка. Навуковыя метады ў беларускім літаратуразнаўстве 1950-70-х гадоў